# § 44. Краіны мусульманскага свету

*1. Якія краіны называюць краінамі «трэцяга свету»? 2. Растлумачце значэнне паняццяў «дэкаланізацыя», «неакаланізацыя».*

Паняцце «ісламскі свет», або «ісламская цывілізацыя», шмат у чым умоўнае. Яно абазначае сукупнасць дзяржаў, насельніцтва якіх у пераважнай большасці вызнае мусульманскую рэлігію.

**Агульная характарыстыка.** У сучасным свеце налічваецца больш за 1 млрд мусульман. Лічыцца, што іслам — рэлігія, якая найхутчэй распаўсюджваецца па планеце. Навукоўцы прадказваюць, што ў XXI ст. на Зямлі гэта рэлігія будзе пераважнай.

Амаль у 50 краінах свету большасць насельніцтва належыць да традыцыйна мусульманскіх этнасаў. У 28 афра-азіяцкіх дзяржавах іслам абвешчаны дзяржаўнай (або афіцыйнай) рэлігіяй. Характэрнай рысай мусульманскага свету з'яўляецца этнічная неаднастайнасць. У ім выдзяляюцца цюркамоўны, персідскі і арабскі рэгіёны. Стрыжань ісламскага свету — краіны арабскага Усходу.

З другой паловы XX ст. у мусульманскім свеце ўзмацніўся ўплыў ісламу на ўсе сферы жыцця грамадства. Адной з прычын таго з'яўляецца спецыфіка гэтай рэлігійнай сістэмы: іслам — не толькі рэлігія, але і лад жыцця.

Пад ісламскімі лозунгамі актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух, узніклі ісламскія палітычныя таварыствы і партыі, міжнародныя арганізацыі. Такая актыўнасць ісламу атрымала назву «*ісламскае адраджэнне*». У1970-я гг., асабліва пасля «ісламскай» рэвалюцыі ў Іране, шырока заявіў пра сябе ў мусульманскім свеце рух, вядомы як ***ісламскі фундаменталізм***. Яго галоўная мэта — вяртанне да асноў веры, г. зн. да «чыстага» першапачатковага ісламу часоў прарока Мухамеда, стварэнне грамадства і дзяржавы на прынцыпах Карана і шарыяту.

**Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі ў арабскім свеце.** Новы ўздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы пачаўся пасля Другой сусветнай вайны. Былі ліквідаваны падмандатныя (каланіяльныя) рэжымы ў Ліване, Сірыі, Палесціне, Іарданіі.

*1950—1960 гг.* азнаменаваліся цэлым шэрагам рэвалюцыйных падзей у арабскіх краінах. У Егіпце была звергнута манархія (1952), завяршылася брытанская акупацыя краіны. У 1954 г. у Алжыры выбухнула васьмігадовая антыкаланіяльная рэвалюцыйная вайна супраць Францыі. Дабіліся незалежнасці Лівія (1951), Марока, Туніс, Судан (1956). Быў знішчаны манархічны рэжым і абвешчана рэспубліка ў Іраку (1958). Усё гэта прывяло да аслаблення пазіцый Захаду на Блізкім Усходзе.

У *1961—1969 гг.* адбылося «паляпенне» многіх арабскіх рэжымаў, а таксама завяршэнне працэсу дэкаланізацыі. У 1961 г. прэзідэнт Егіпта Г. А. Насер пачаў «некапіталістычныя» рэформы. У ходзе вызваленчай вайны дабіліся незалежна-

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Злева направа*: кароль Саудаўскай Аравіі Фейсал ібн Абдул-Азіз Аль Сауд, кіраўнік дзяржавы Вялікая Сацыялістычная Народная Лівійская Арабская Джамахірыя Муамар Кадафі, Прэзідэнт Еменскай Арабскай Рэспублікі Абдэль Рахман аль-Ях'я Ар'яні, Прэзідэнт Егіпта Гамаль Абдэль Насер. Верасень 1970 г.

сці алжырцы (1962). Адбылася антыманархічная рэвалюцыя ў Емене (1962). У лютым 1963 г. Партыя арабскага сацыялістычнага адраджэння, або Баас, прыйшла да ўлады ў Іраку. У 1969 г. быў звергнуты каралеўскі рэжым у Лівіі.

**Егіпет.** Гісторыя гэтай дзяржавы ўяўляе сабой асаблівы варыянт мадэрнізацыі. Краіна прайшла складаны шлях ад антыманархічнай рэвалюцыі і сацыялістычнай арыентацыі да ўмацавання і развіцця рыначных адносін і саюзу з Захадам.

Важную старонку ў гісторыі Егіпта адкрыла зьяржэнне манархіі ў 1952 г. арганізацыяй «Свабодныя афіцэры» на чале з *Гамалем Абдэль Насерам*. У перыяд кіравання прэзідэнта Насера краіна дасягнула вялікіх поспехаў у эканоміцы. У 1956 г. быў нацыяналізаваны Суэцкі канал. У выніку прагрэсіўнай аграрнай рэформы сяляне атрымалі зямлю. Былі пабудаваны Асуанская вышынная плаціна, якая дала магчымасць арасіць вялізныя плошчы ў даліне Ніла, і шэраг буйны́х прамысловых прадпрыемстваў. Істотную ваенную і эканамічную дапамогу Егіпет атрымліваў ад Савецкага Саюза. У пачатку 1960-х гг. егіпецкае кіраўніцтва абвясціла курс на пабудову сацыялізму.

Пасля паражэння Егіпта ў вайне 1967 г. з Ізраілем у егіпецкім грамадстве ўзмацніліся праамерыканскія настроі. Пераемнікі Насера ўзялі курс на збліжэнне з Захадам. У сацыяльна-эканамічнай сферы яны сутыкнуліся з цяжкавырашальнай задачай. З аднаго боку, неабходна было паскараць эканамічныя рэформы, з іншага — падтрымліваць беднату, каб не дапусціць сацыяльнага выбуху.

**Іран.** Пасля Другой сусветнай вайны Іран знаходзіўся пад уплывам Вялікабрытаніі і ЗША, якіх прываблівалі вялікія запасы іранскай нафты і магчымасці выгадна ўкладваць капіталы. Празаходняя палітыка Ірана праявілася ў падпісанні ў 1959 г. пагаднення з ЗША.

У сярэдзіне 1950-х гг. у Іране ўзмацнілася асабістая ўлада шаха *Мухамеда Рэза Пехлеві*. У краіне была забаронена дзейнасць палітычных партый. У пачатку 1960-х гг. пад кіраўніцтвам шаха пачаліся рэформы, якія атрымалі назву *«белай рэвалюцыі»* (белы колер — сімвал манархіі). Найважнейшым складнікам гэтай рэвалюцыі стала аграрная

Правообладатель Издательский центр БГУ



Ісламская рэвалюцыя
пад кіраўніцтвам аяталы Хамейні карэнным
чынам змяніла лад жыцця іранцаў

рэформа. Яна падарвала памешчыцкае землеўладанне іператварыла большасць сялян ва ўласнікаў.

У гады «белай рэвалюцыі» была праведзена прыватызацыя дзяржаўных прадпрыемстваў і нацыяналізацыя лясоў і пашы, а таксама водных рэсурсаў. На землі мячэцяў уводзіліся падаткі, што пазбаўляла духавенства даходаў. Прымаліся меры па барацьбе з непісьменнасцю, паляпшалася медыцынскае абслугоўванне сельскага насельніцтва. У Іране з'явіліся новыя галіны прамысловасці: аўтамабільная, алюмініевая, нафтахімічная. Гарады набывалі больш сучаснае аблічча. У Іран пранікала заходняя культура. Жанчынам былі дадзены выбарчыя правы. У краіне ўводзілася свецкае судаводства, бясплатная васьмігадовая адукацыя. Найважнейшай крыніцай мадэрнізацыі краіны сталі паступленні ад продажу нафты.

Аднак рэзкі курс шаха на паскоранае развіццё Ірана па заходнім узоры быў варожа сустрэты значнай часткай іранскага грамадства, уключаючы мусульманскае духавенства, гандлёва-прамысловыя колы і інтэлігенцыю.

У ***1978 г.*** у Іране выбухнула антыманархічная рэвалюцыя, вядомая таксама як *«ісламская рэвалюцыя»*. Магутны антышахскі рух узначаліў *аятала Хамейні*. Прыхільнікі Хамейні авалодалі Тэгеранам. У краіне быў праведзены рэферэндум, у выніку якога 1 красавіка ***1979 г.*** была абвешчана Ісламская Рэспубліка Іран. Згодна з новай канстытуцыяй вышэйшая ўлада з гэтага часу належала духавенству. Заходнія дзяржавы поўнасцю пазбаўляліся свайго ўплыву ў краіне. Новае іранскае кіраўніцтва адмовілася ад капіталізму і камунізму. Яно проціпаставіла ім уласны ісламскі шлях развіцця. Эканоміку новай рэспублікі склалі дзяржаўны, кааператыўны і прыватны сектары.

**Турцыя.** У адрозненне ад Егіпта або Ірана *Турэцкая Рэспубліка* ўяўляла сабой іншы варыянт мадэрнізацыі ў пасляваенны перыяд.

*Першы этап (1945—1960).* Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў Турцыі характарызавалася змякчэннем аўтарытарнасці рэжыму і пашырэннем дэмакратычных асноў улады. Былі прыняты законапраекты аб пераходзе ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнай. Намецілася збліжэнне з ЗША і іншымі заходнімі краінамі. Турцыя была ўключана ў сферу дзеяння «дактрыны Трумэна» і «плана Маршала». Амерыканская дапамога пайшла пераважна на ваеннае будаўніцтва. У канцы 1950-х гг. краіну ахапілі хваляванні, урад прыняў шэраг мер па падаўленні апазіцыі. У гэтых умовах у маі

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Злева направа*: Прэзідэнт Ірана Хасан Рухані, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін і Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган на перагаворах у Сочы. Лістапад 2017 г.

1960 г. адбыўся ваенны пераварот. Была адменена Канстытуцыя 1924 г., распушчаны парламент, забаронена дзейнасць палітычных партый.

*Другі этап (1960—1980)* характарызаваўся палітычнай лібералізацыяй. Згодна з новай Канстытуцыяй (1961) Турцыя вызначалася як «сацыяльна-прававая дзяржава». Важнай асаблівасцю *Другой рэспублікі* было ўмацаванне шматпартыйнай сістэмы. У 1960—1970-я гг. Турцыя ператварылася ў аграрна-індустрыяльную краіну. Аднак у эканоміцы не ўдавалася забяспечыць устойлівыя тэмпы росту, а ў палітыцы — ліквідаваць вострае саперніцтва паміж прыхільнікамі этатызму і лібералізацыі і пашырэння прыватнай ініцыятывы. Абвастрэнню сітуацыі ў краіне спрыяла дзейнасць розных экстрэмісцкіх арганізацый.

Ваеннае кіраўніцтва зноў вырашыла ўзяць ініцыятыву ў свае рукі і ў *1980 г.* ажыццявіла дзяржаўны пераварот. Урад быў звергнуты, парламент распушчаны, дзейнасць партый і прафсаюзаў прыпынена. Армія заставалася пры ўладзе больш за тры гады.

У *1982 г.* была ўведзена ў дзеянне новая Канстытуцыя Турцыі. З таго часу пачала свой адлік *Трэцяя Рэспубліка*. У краіне былі абвешчаны буйнамаштабныя рэформы. «Бацька турэцкіх рэформаў», прэм'ер-міністр *Тургут Азал*, адмовіўся ад строгага дзяржаўнага рэгулявання і абмежавання росту рэальных даходаў насельніцтва. Эканоміка адкрылася для замежных тавараў і капіталаў. Прыярытэтным стала развіццё сярэдняга і малога бізнесу. Тэмпы эканамічнага росту ў 1980—1990 гг. склалі каля 8 % у год.

У гэты час у грамадска-палітычным жыцці краіны ўзмацніўся ўплыў ісламскіх арганізацый. На парламенцкіх выбарах 2002 і 2007 гг. бясспрэчную перамогу атрымала памяркоўная ісламісцкая *Партыя справядлівасці і развіцця (ПСР)*. Прэм'ерам стаў адзін з лідараў ПСР *Рэджэп Таіп Эрдаган*. І хаця партыю абвінавачваюць у ісламізме, яна арыентуецца на заходнія каштоўнасці, такія як рыначная эканоміка і ўступленне ў Еўрапейскі Саюз. За час кіравання ПСР Турцыя перажыла перыяд эканамічнага росту і перамагла шматгадовую гіперінфляцыю. На Захадзе многія называюць кіраванне ПСР самым паспяховым за апошнія пяцьдзясят гадоў.

**1.** Ахарактарызуйце сучасную мусульманскую (ісламскую) цывілізацыю. Выкарыстайце картасхему «Ісламскі свет» на другім форзацы. Якую ролю адыгрывае іслам у жыцці вернікаў?

Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Чаму пасля Другой сусветнай вайны ўзмацніўся ўплыў ісламу ў свеце? Якія ідэі пакладзены ў аснову фундаменталісцкіх плыняў ісламу?
3. Апішыце працэс дэкаланізацыі краін арабскага рэгіёна пасля Другой сусветнай вайны.
4. Ахарактарызуйце егіпецкі варыянт мадэрнізацыі. Высветліце сацыяльна-эканамічнае становішча сучаснага Егіпта.
5. Якія асаблівасці мае працэс мадэрнізацыі ў Іране? Чаму іранскае грамадства не ўспрыняло «белай рэвалюцыі»? Ахарактарызуйце дзяржаўны лад Ісламскай Рэспублікі Іран. Выкарыстайце дакумент.
6. Дайце ацэнку турэцкаму варыянту мадэрнізацыі. Вызначце, у чым супярэчлівасць правядзення мадэрнізацыі ў Турцыі.

Турцыя на працягу доўгага часу спрабуе ўступіць у Еўрапейскі Саюз. Аднак, згодна з апошнімі апытаннямі грамадскай думкі, ад 70 да 90 % еўрапейцаў не хочуць бачыць турак у еўрапейскай сям'і. Якія асаблівасці развіцця Турцыі перашкаджаюць яе ўступленню ў ЕС?

**З Канстытуцыі Ісламскай Рэспублікі Іран. 1979 г.**

Адметная асаблівасць нашай рэвалюцыі ў параўнанні з іншымі рэвалюцыйнымі рухамі ў Іране за апошняе стагоддзе заключаецца ў яе рэлігійным, ісламскім характары. Прайшоўшы шлях ад антыдэспатычнага руху за канстытуцыйную манархію да руху за нацыяналізацыю нафты, іранскі народ набыў вельмі каштоўны вопыт, які сведчыў, што пералічаныя вышэй рухі не мелі поспеху з прычыны свайго нерэлігійнага характару…

*У чым асаблівасць рэвалюцыйнага руху ў Іране?*

# § 45. Краіны Лацінскай Амерыкі

*1. Якую палітыку адносна краін Лацінскай Амерыкі праводзілі ЗША ў міжваенны перыяд? 2. Чаму ў палітычным жыцці краін Лацінскай Амерыкі вялікую ролю адыгрываюць ваенныя?*

Лацінская Амерыка — агульная назва рэгіёна, які ўключае ў сябе тэрыторыі паўднёвай часткі Паўночнай Амерыкі, усю Цэнтральную і Паўднёвую Амерыку, а таксама Вест-Індыю.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** У XX ст. па-ранейшаму захоўвалася традыцыйная арыентацыя эканомікі лацінаамерыканскіх дзяржаў на экспарт прадуктаў харчавання і сыравіны. Тым не менш сусветныя эканамічныя крызісы вымусілі іх

Правообладатель Издательский центр БГУ